Гэта траўматалагічнае аддзяленне адной з мінскіх бальніц. СТАР.6



# АСВЕЯ. ГЭТА БЫЛО...

**Семдзесят гадоў таму — у лютым-сакавіку 1943 года — фашысцкія карнікі правялі на тэрыторыі Асвейскага, Дрысенскага і Расонскага раёнаў аперацыю пад назвай «Winterzauber» — «Зімовае чараўніцтва». Гэта была адна з самых жорсткіх і крывавых карных акцый, учыненых захопнікамі на нашай зямлі за ўвесь перыяд вайны. У СССР яна атрымала назву «Асвейская трагедыя».**

Мэтай карнікаў было стварэнне нейтральнай зоны адчужэння шырынёю ў 40 кіламетраў без жыхароў і населеных пунктаў паміж Дрысай (Верхнядзвінскам) на поўдні і горадам Зілупэ (Латвія) на поўначы. Зона ахоплівала раён Асвея — Дрыса — Полацк — Расоны — Себеж . Аперацыя лічылася антыпартызанскай, і спустошаная зона павінна была пазбавіць партызанскія злучэнні апорных пунктаў. Паколькі баявога супрацьстаяння з партызанскімі падраздзяленнямі амаль не адбывалася, карныя акцыі былі зведзены да масавых забойстваў насельніцтва.




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Узгадвае ТАРЛЕЦКАЯ Ніна Аркадзьеўна, 1936 г.н., з вёскі Доўгае колішняга Дрысенскага, а цяпер Верхнядзвінскага раёна:**

— Нас у маці было трое: я, брат і меншая сястрычка. Частку вёскі Доўгае немцы спалілі яшчэ ў 1942 годзе. З таго часу мы жылі ў лесе. Можа з год правялі ва ўрочышчы Ярмолінскі кацёл. Потым перабраліся ў свой лес бліжэй да вёскі, вырылі зямлянкі, парабілі ў іх патаемныя нішы, у якіх хаваліся ў час карнай аперацыі.

У лютым 1943-га прыйшоў карны атрад, і вёску спалілі поўнасцю. Тады загінула шмат жыхароў, якія вярнуліся з лесу раней, спадзеючыся, што фашысты сюды больш не прыйдуць. А нас у лесе карнікі не знайшлі.

Калі мы нарэшце прыйшлі ў сваё Доўгае, убачылі жудаснае відовішча: каля зямлянак ляжалі забітыя людзі, якія вярнуліся раней. Жанчыны, дзеці, старыя. Шмат. І ніводнай жывой душы. Пахавалі ўсіх у тым месцы, дзе цяпер стаіць помнік, — 40 чалавек.

А мы жылі ў зямлянках, пакуль у 1952 годзе нарэшце не пабудавалі сваю хату.

СТАР.6

